*Эмануіл Іофе,*
*кандыдат гістарычных навук*

# «ТОЙ САМЫ НЕКРАШЭВІЧ...»

Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч нарадзіўся 8 мая 1883 года ў вёсцы Данілаўка Бабруйскага павета (цяпер Светлагорскі раён Гомельскай вобласці.— *Э. І.*) у сялянскай сям'і. Грамаце пачаў вучыцца ў «дарэктара». Толькі ў 25-гадовым узросце Некрашэвічу давялося скончыць Панявежыскую настаўніцкую семінарыю і атрымаць сярэднюю адукацыю. Пасля гэтага ён працаваў настаўнікам пачатковай школы ў Цельшаўскім павеце Ковенскай губерні, а ў 1911—1913 гадах — настаўнікам школы «Общества трезвости» ў Вільні. Адначасова Сцяпан Некрашэвіч вучыўся ў Віленскім настаўніцкім інстытуце, які скончыў у 1913 годзе. Затым—праца ў вышэйшай пачатковай школе мястэчка Даловы Дзвінскага павета.

У 1914 годзе Сцяпан Міхайлавіч быў мабілізаваны ў армію і ўсю вайну правёў на фронце. Пасля Лютаўскай рэвалюцыі быў выбраны членам армейскага камітэта 6-ай арміі. З 1 верасня 1917 года Сцяпан Міхайлавіч — чыноўнік вайсковага часу. Тут, на фронце, трапіў пад уплыў ідэй беларускага нацыянальна-вызваленчага руху.

Кастрычніцкія падзеі 1917 года засталі Некрашэвіча ў Адэсе. Ён не зразумеў і не прыняў рэвалюцыі і ўключыўся ў антысавецкую дзейнасць. Пад яго кіраўніцтвам там быў створаны контррэвалюцыйны цэнтр пад назвай «Беларускі нацыянальны камісарыят у Адэсе».

Дэмабілізаваўшыся з арміі ў 1918 годзе, Сцяпан Міхайлавіч галоўным чынам жыў у Адэсе. Тут ён паступіў у Вышэйшы міжнародны інстытут, дзе праслухаў толькі два першыя курсы. Некрашэвіч загадваў беларускай секцыяй пры Адэскім губернскім аддзеле народнай асветы. Адначасова вёў значную культурна-асветніцкую работу сярод дэмабілізаваных салдат-беларусаў і бежанцаў-беларусаў, якія воляй лёсу апынуліся ў гэтым прыморскім горадзе. Дзякуючы намаганням Некрашэвіча на пачатку 1918-га навучальнага года ў Адэсе было адкрыта 30 пачатковых беларускіх школ і беларуская змешаная гімназія ў складзе першых чатырох класаў (Дзянніца. 1918. 30 кастр.).

У выніку распаду Беларускай сацыялістычнай грамады ў 1918 годзе ўзнікла Беларуская партыя сацыялістаў-рэвалюцыянераў. БПС-Р, партыя беларускіх эсэраў, якая папоўнілася за лік лева- і праваэсэраўскіх арганізацый. Яна абапіралася на заможнае сялянства, дробную буржуазію, нацыяналістычную інтэлігенцыю. Адным з кіраўнікоў гэтай партыі стаў С. М. Некрашэвіч.

13 студзеня 1919 года старшыня «Беларускага нацыянальнага цэнтра» С. М. Некрашэвіч звярнуўся да камандуючага войскамі Антанты генерала Бертэло з мемарандумам аб стварэнні Заходняй беларускай арміі. Гэта арганізацыя знаходзілася ў Адэсе. Вось што пісаў кіраўнік «БНЦ» камандуючаму войскамі Антанты на поўдні Расіі: «Беларускі нацыянальны цэнтр», сфарміраваны з большасці грамадскіх і нацыянальных арганізацый Беларусі, узяў на сябе ў гэты цяжкі момант фарміраванне тутэйшага ўрада, а таксама і арганізацыю беларускай арміі (Заходняй арміі), якая мае на мэце, як і Добраахвотніцкая армія барацьбу з бальшавікамі». Некрашэвіч абяцаў стварыць з бежанцаў, якія ўцяклі з Беларусі, вайсковы кантынгент колькасцю да 40 тысяч чалавек. Але з гэтай задумы нічога не выйшла. Нават тыя нешматлікія фармі-

раванні, якія пацыяналістам удалося стварыць, пры першым сутыкненні з войскамі Чырвонай Арміі распадаліся.

4 сакавіка 1920 года на з'ездзе ў Мінску БПС-Р вымушана была адмовіцца ад узброенай барацьбы з Савецкай уладай.

Бальшавікі Беларусі, не спыняючы ідэйна-палітычнай барацьбы з БПС-Р, падтрымлівалі яе выступленні супраць польскіх інтэрвентаў. 29 красавіка 1920 года ЦК КП(б)Л і Б, згодна ўказанню ЦК РКП(б), увёў сваіх прадстаўнікоў у Беларускі паўстанцкі камітэт, арганізаваны ў Мінску беларускімі эсэрамі. Пасля вызвалення Беларусі ад белапалякаў БПС-Р выставіла свае патрабаванні, якія бальшавікі не прынялі. І тады ЦК БПС-Р адмовіўся прызнаць Дэкларацыю аб абвяшчэнні незалежнасці БССР.

З гісторыі не выкрасліш і той факт, што 25 снежня 1920 года на з'ездзе Беларускай партыі эсэраў, які адбыўся ў Мінску, менавіта С. М. Некрашэвіч, як сведчаць аўтарытэтныя архіўныя дакументы, патрабаваў, каб гэта партыя перайшла ў падполле і пачала «актыўную ўзброеную барацьбу з камуністамі». Але хутка ён адыходзіць ад палітычнай дзейнасці, займаецца навуковай і грамадскай работай.

Пасля вызвалення БССР ад белапалякаў Сцяпан Міхайлавіч пераязджае ў Мінск і працуе ў Народным камісарыяце асветы БССР спачатку загадчыкам літаратурнавыдавецкага аддзела, пасля намеснікам старшыні акадэмічнага цэнтра, інспектарам навуковых устаноў і намеснікам старшыні Галоўпрафасветы. Адначасова з гэтым з 1921 года Некрашэвіч быў старшынёй навукова-тэрміналагічнай камісіі Наркамата асветы рэспублікі.

У канцы 1920-га і ў пачатку 1921 года ў ЦБ КП(б)Б і Народным камісарыяце асветы БССР паўстала пытанне аб арганізацыі першага навукова-даследчага цэнтра ў рэспубліцы — Інстытута беларускай культуры.

27 студзеня 1921 года ў будынку Наркамата асветы сабралася каля 50 працаўнікоў культуры з многіх гарадоў рэспублікі. Яны прыбылі на сход. Быў заслуханы даклад С. М. Некрашэвіча аб беларускім культурным адраджэнні, з якога вынікала, што трэба «арганізаваць адпаведную лабараторыю» і назваць яе Інстытутам беларускай культуры.

Аднак заснаваць Інбелкульт у той час не ўдалося. Не хапала кваліфікаваных кадраў і матэрыяльных сродкаў. Нягледзячы на гэта, ідэя аб стварэнні ІБК не прапала. Яна была рэалізавана ў форме асобнай навукова-тэрмінала-

гічнай камісіі Наркамата асветы. Душой і арганізатарам усёй бурнай дзейнасці навукова-тэрміналагічнай камісіі быў Сцяпан Некрашэвіч. Некрашэвіч рашуча паўставаў супраць насілля над мовай. Ён гаварыў, што работа над родным словам — вельмі цяжкая, але высакародная.

Велізарная работа, якую вёў Сцяпан Міхайлавіч разам са сваімі паплечнікамі, давала добрыя вынікі. Ужо праз два месяцы пасля ўтварэння навукова-тэрміналагічнай камісіі яе секцыі апрацавалі каля 2270 тэрмінаў, акрамя таго, звыш 5 тысяч тэрмінаў было падрыхтавана для зацверджання.

Паспяховая работа гэтай камісіі дала ўсе падставы для рэалізацыі рашэння аб стварэнні Інстытута беларускай культуры.

У мэтах пашырэння навукова-даследчай работы ў рэспубліцы ўлады звярнуліся ў СНК РСФСР з хадайніцтвам аб аказанні Беларусі практычнай дапамогі ў далейшым развіцці навуковых даследаванняў. Урад РСФСР выдаў распараджэнне ад 12 мая 1921 года, на падставе якога работнікі культуры і навукі — ураджэнцы Беларусі па іх згодзе накіроўваліся на работу ў сваю рэспубліку.

30 студзеня 1922 года на базе навукова-тэрміналагічнай камісіі была заснавана першая шматгаліновая навукова-даследчая ўстанова рэспублікі — Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). У распрацоўцы яго статута прынялі ўдзел выдатны вучоны філолаг і этнограф акадэмік Я. Ф. Карскі, вядомы гісторык, прафесар У. І. Пічэта, мастацтвазнаўца і пісьменнік Я. Л. Дыла. Перад Інбелкультам была пастаўлена задача арганізацыі планамернага вывучэння этнаграфіі, мовы, літаратуры, мастацтва, гісторыі, геаграфіі, прыроды, эканомікі, сацыяльна-грамадскага руху Беларусі, а таксама аб'яднання і каардынавання ўсёй навукова-даследчай працы, якая праводзілася ўстановамі і асобнымі працаўнікамі рэспублікі.

У састаў кіраўніцтва Інбелкульта ўвайшлі: С. Некрашэвіч — старшыня, У. Чаржынскі — сакратар, І. Луцэвіч (Я. Купала), К. Міцкевіч (Я. Колас), Я. Лёсік і Я. Карскі — правадзейныя члены.

За 1922—1924 гады Інстытут беларускай культуры пад кіраўніцтвам Сцяпана Некрашэвіча правёў значную навуковую работу, асабліва па распрацоўцы тэрміналогіі, складанню і выданню падручнікаў для школ. Паспяхова праводзіліся экспедыцыі па вывучэнню прыродных багаццяў Беларусі. У сувязі з адкрыццём у 1924 годзе сельска-

гаспадарчай выстаўкі ў Маскве кіраўніцтва Інбелкульта напярэдадні накіравала ў Чэрвеньскі і Бабруйскі раёны этнаграфічныя экспедыцыі, якія сабралі каля 340 экспанатаў матэрыяльнай і духоўнай культуры (сярод іх тканіны, паясы, вышыўка, музыкальныя народныя інструменты і інш.) і зрабілі шмат фотаздымкаў. Беларускі этнаграфічны аддзел на выстаўцы атрымаў вышэйшую прэмію.

Характэрнай з'явай таго часу была арганізацыя вакол Інбелкульта краязнаўчага руху. Некрашэвіч быў адным з ініцыятараў стварэння пры Інстытуце беларускай культуры ў 1924 годзе Цэнтральнага бюро краязнаўства (ЦБК). Супрацоўнікі Інбелкульта разгарнулі работу сярод насельніцтва ў мэтах стварэння краязнаўчых арганізацый на месцах, накіроўвалі іх дзейнасць, аказвалі ўсебаковую практычную дапамогу. Краязнаўчыя арганізацыі будаваліся па прынцыпу: акруговыя і раённыя таварыствы, гурткі пры школах, сельсаветах, хатах-чытальнях і іншых установах. Такія арганізацыі былі створаны ў Магілёве, Віцебску, Оршы, Барысаве, Чэрвені.

Па прапанове Некрашэвіча старшынёй гуманітарнай секцыі Інбелкульта быў прызначаны Янка Купала, а яе членамі — Якуб Колас, Змітрок Бядуля і іншыя відныя дзеячы культуры Савецкай Беларусі. Ужо ў 1923 годзе па іх ініцыятыве Інстытутам беларускай культуры быў выдадзены зборнік «Беларуская навуковая тэрміналогія. Выпуск другі. Практыка і тэорыя літаратурнага мастацтва». Асабліва бурную дзейнасць развіў Янка Купала. З ім раіліся па многіх пытаннях. Купалу паважалі. Ён быў аўтарытэтам. Купала заўсёды адчуваў падтрымку сваёй працы з боку старшыні Інбелкульта С. М. Некрашэвіча.

25 ліпеня 1924 года ЦВК і СНК БССР зацвердзілі «Палажэнне аб Інстытуце беларускай культуры», згодна якому Інбелкульт быў вызначаны як вышэйшая дзяржаўная навуковая ўстанова рэспублікі, якая ўваходзіць у састаў Наркамасветы БССР. Яму было дадзена права адкрываць музеі, бібліятэкі, архівы, склікаць навуковыя канферэнцыі, з'езды, праводзіць раскопкі, арганізоўваць экспедыцыі і г. д. Па пытаннях навукі і асветы Інстытуту беларускай культуры давалася права мець ненасрэдныя зносіны з замежнымі краінамі, атрымліваць бяспошлінна замежную літаратуру і прыборы для навуковых даследаванняў.

Згодна з «Палажэннем аб Інстытуце беларускай культуры» ад 25 ліпеня 1924 года, у Інбелкульце было ство-

рана 7 секцый: лінгвістычная, літаратурна-мастацкая, этнаграфічная, гісторыка-археалагічная, педагагічная, прыродазнаўчая і сацыяльна-эканамічная.

У лістападзе 1924 года старшынёй Інстытута беларускай культуры быў выбраны У. М. Ігнатоўскі. А правадзейны член Інбелкульта С. М. Някрашэвіч працуе намеснікам старшыні Галоўпрафасветы Наркамата асветы БССР.

У 1923—1925 і ў 1927 годзе Сцяпан Міхайлавіч працаваў спачатку выкладчыкам, а потым дацэнтам Беларускага дзяржаўнага універсітэта. Рэктар БДУ, адзін з аўтараў статута Інбелкульта, а потым і яго правадзейны член, прафесар Уладзімір Іванавіч Пічэта добра ведаў Някрашэвіча і паважаў яго за эрудыцыю і арганізатарскі талент.

К канцу 1928 года Інстытут беларускай культуры стаў арганізацыйна ўмацнеўшай навуковай установай, у якой разгарнулася навукова-даследчая работа. Найбольш значнымі былі дасягненні Інбелкульта ў галіне грамадскіх навук. Разам з гэтым рос і аўтарытэт старшыні аддзела грамадскіх навук С. М. Някрашэвіча.

Сцяпан Міхайлавіч уваходзіў у састаў урадавай камісіі, якая падрыхтавала і праводзіла рэарганізацыю Інстытута беларускай культуры ў Беларускую акадэмію навук. Пастановай Савета Народных Камісараў БССР ад 26 снежня 1928 года С. М. Някрашэвіч быў зацверджаны правадзейным членам і віцэ-прэзідэнтам Беларускай акадэміі навук. Адначасова ён увайшоў у састаў Прэзідыума БАН.

Сцяпан Міхайлавіч Някрашэвіч быў не толькі ўмелым арганізатарам навукі, здольным выкладчыкам, але і таленавітым вучоным. Сярод асноўных напрамкаў яго навуковай дзейнасці мы называем лексікаграфію і правапіс, беларускую дыялекталогію і гісторыю беларускай мовы. Ён распрацаваў тэарэтычныя асновы і прынцыпы стварэння дыялекталагічных слоўнікаў беларускай мовы.

За дзесяць гадоў Някрашэвіч пакінуў значны след у беларускай савецкай навуцы. Мы ўжо адзначалі, што Сцяпан Міхайлавіч кіраваў даследаваннямі ў галіне грамадскіх навук, быў добрым арганізатарам. Але былі такія галіны, дзе ён прымаў удзел непасрэдна. Па-першае, гаворка ідзе аб апрацоўцы беларускай навуковай тэрміналогіі па лінгвістыцы, літаратуразнаўству, матэматыцы, логіцы, геаграфіі, біялогіі, астраноміі, псіхалогіі, музыцы, іншых галінах ведаў. Пачынаючы з 1922 года, за восем гадоў выйшлі 23 выпускі беларускай навуковай тэрміналогіі, якія задаво-

лілі патрэбы школьнага і інстытуцкага выкладання.

Калі Сцяпан Міхайлавіч у лютым 1925 года ўзначаліў спецыяльную камісію Інбелкульта па ўкладанню слоўніка жывой беларускай мовы, ён адразу ж вызначыў і тэарэтычна абгрунтаваў тып намячонага слоўніка, крыніцы лексічнага матэрыялу, метады яго збірання і нават структуру артыкулаў.

С. М. Некрашэвіч акцэнтаваў увагу на наступныя крыніцы лексічнага матэрыялу для слоўніка жывой беларускай мовы: 1) народную мову, прадстаўленую не гаворкамі і лепшымі фальклорнымі запісамі, 2) літаратурную мову, 3) папярэднія лексікаграфічныя працы-слоўнікі І. Насовіча, М. Федароўскага, П. Шпілеўскага, часткова У. Дабравольскага і Я. Ціхінскага.

Камісія па ўкладанню слоўніка жывой беларускай мовы планавала сабраць неабходны лексічны матэрыял з трох названых крыніц не раней чым за тры гады. Але яна сама разумела, што гэта нерэальна, таму што колькасць супрацоўнікаў камісіі была невялікай. І тады Сцяпан Міхайлавіч прапанаваў звярнуцца за дапамогай да шырокай грамадскасці рэспублікі.

Заклік Сцяпана Міхайлавіча знайшоў шырокі водгук сярод насельніцтва. У работу па збіранню народнай і літаратурнай лексікі ўключыліся тысячы людзей розных узростаў і роду заняткаў — настаўнікі, сяляне, рабочыя, урачы, студэнты і нават вучні. К канцу 1927 года картатэка слоўніка жывой беларускай мовы налічвала звыш 400 000 картак-слоў.

На вялікі жаль, пасля арышту ў 1930 годзе С. М. Некрашэвіча і іншых спецыялістаў работа па гэтай праблеме над слоўнікам жывой беларускай мовы спынілася. І яшчэ адна бяда. У час Вялікай Айчыннай вайны ўся картатэка і ўжо апрацаваныя слоўнікавыя артыкулы загінулі.

Разам з М. Байковым Сцяпан Міхайлавіч складае ў 1925 годзе «Беларуска-расійскі слоўнік» на 30 тысяч слоў і «Расійска-беларускі слоўнік» у 1928 годзе на 60 тысяч слоў. У радзе рэцэнзій, апублікаваных у 1927—1928 гадах у часопісах «Узвышша», «Узвым», газеце «Звязда», адзначаліся не толькі станоўчыя моманты гэтых кніг, але і іх недахопы. Усё гэта так, але галоўнае не ў гэтым. Ацэньваючы слоўнікі Байкова і Некрашэвіча з пазіцый сённяшняга дня, можна сказаць, што ў другой палове 20-ых гадоў гэтыя работы мелі выключнае значэнне. Не трэба забываць, што ў той час нормы беларускай літаратурнай мовы знаходзіліся яшчэ ў стадыі станаўлення, а тэрмінало-

гія, асабліва ў галіне грамадскіх і дакладных навук, толькі выпрацоўвалася. Патрэба ў такіх лексікаграфічных працах выклікалася стварэннем школы з роднай мовай навучання, пераходам на беларускую мову справаводства, развіццём навукі і культуры.

Нельга не згадзіцца з думкай І. К. Германовіча, што пры ўсіх сваіх недахопах, асабліва відавочных з пункту гледжання цяперашняга стану беларускай літаратурнай мовы, перакладныя слоўнікі С. М. Некрашэвіча і М. Я. Байкова з'явіліся важным этапам у гісторыі нацыянальнай лексікаграфіі і аж да выхаду ў 1953 годзе «Русско-белорусского словаря» пад рэдакцыяй Я. Коласа, К. Крапівы, П. Глебкі і ў 1962 годзе «Беларуска-рускага слоўніка» пад рэдакцыяй К. Крапівы заставаліся найбольш грунтоўнымі працамі гэтага тыпу.

1 кастрычніка 1927 года была створана новая правапісная камісія на чале з Некрашэвічам. На сваім пасяджэнні з удзелам прадстаўнікоў Наркамата асветы БССР яна вырашыла ў аснову беларускага правапісу пакласці ўжо апрабаваны на практыцы правапіс, прапанаваны Б. Тарашкевічам, удакладніўшы ў ім некаторыя правілы і дапоўніўшы яго шэрагам новых правіл.

17 красавіка 1929 года камісія прыняла праект беларускага правапісу, які ў 1930 годзе быў надрукаваны тысячным тыражом і разасланы спецыялістам і ў розныя ўстановы для абмеркавання.

Існавала адна праблема, якая доўгі час хвалявала Сцяпана Міхайлавіча,— «Васіль Цяпінскі. Яго прадмова, пераклад евангелля на беларускую мову і мова перакладу». Вельмі шкада, што гэта даследаванне, як і работа, прысвечаная мяккаму «р» у любанскіх гаворках, таксама не пабачыла свету. Рукапіс, відаць, загінуў у час Вялікай Айчыннай вайны.

Чакае свайго даследчыка тэма «С. М. Некрашэвіч як аўтар падручнікаў і вучэбных дапаможнікаў». Менавіта Сцяпан Міхайлавіч быў аўтарам першага паслярэвалюцыйнага буквара «Беларускі лемантар» (1922, 6-ае выд.— 1929) і першай паслярэвалюцыйнай чытанкі «Роднае слова» ў двух кнігах (кн. I — 1922, 3-яе выд.— 1926, кн. II — 1922, 4-ае выд.— 1925). У сааўтарстве з М. Байковым і А. Багдановічам таксама склаў спецыяльны дапаможнік для ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых з сімвалічнай назвай — «Наша сіла — ніва ды машына» (1925, 2-ое выд.— 1927).

Сцяпан Міхайлавіч Некрашэвіч быў вядомым грамад-

скім і дзяржаўным дзеячам Беларусі 20-ых гадоў. Яго неаднаразова выбіралі дэпутатам усебеларускіх з'ездаў Саветаў і членам Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР.

У канцы 20-ых гадоў на небасхіле жыцця С. М. Некрашэвіча з'явіліся чорныя хмары. Менавіта ў той час абвастрылася барацьба з ідэалогіяй нацыянал-дэмакратызму, якая вызначалася як варожая Савецкай уладзе контррэвалюцыйная плынь.

Яшчэ ў 1926 годзе Інстытут беларускай культуры падрыхтаваў і выпусціў юбілейны зборнік дакументаў і матэрыялаў, прысвечаны 400-годдзю друку на Беларусі. У гэтай кнізе расказвалася пра плённую дзейнасць вялікага асветніка, ураджэнца Полацка Францыска Скарыны, які на некалькі дзесяцігоддзяў апярэдзіў у кнігадрукаванні свайго калегу рускага і ўкраінскага першадрукара Івана Фёдарава. Здавалася б, што тут антыпатрыятычнага, нацыяналістычнага?

Аднак гэтага аказалася дастаткова, каб сакратар ЦК КП(б)Б В. Г. Кнорын у адной з сваіх прац у 1928 годзе выступіў з праграмнай заявай, у якой асудзіў увесь ход навуковай дзейнасці ў галіне беларускай літаратуры і мовазнаўства.

Спачатку нацыянал-дэмакратызм тлумачыўся як правая небяспека ў культурным будаўніцтве, як тэндэнцыя ставіць нацыянальныя інтарэсы вышэй класавых, узвпічваць нацыянальную форму на шкоду яе пралетарскаму зместу. У хуткім часе палітычныя ацэнкі нацыянал-дэмакратызму сталі больш вострымі, аж да аналогіі з нацыянал-фашызмам.

На аснове рашэння прэзідыума Беларускай акадэміі навук СНК БССР 16 кастрычніка 1929 года прыняў пастанову аб вызваленні з займаемых пасад сакратара БАН В. У. Ластоўскага і віцэ-прэзідэнта БАН С. М. Некрашэвіча, якія непасрэдна адказвалі за выдавецкую прадукцыю.

У канцы 20-ых гадоў, калі напал палітычнай барацьбы абвастрыўся да мяжы, была ўзбуджана «справа» аб беларускіх нацдэмах. Па гэтай «справе» разам з Некрашэвічам праходзілі Ластоўскі, Лёсік, Цвікевіч і іншыя прадстаўнікі старой беларускай інтэлігенцыі.

У кастрычніку 1930 года адбыўся пленум ЦК КП(б)Б, які спецыяльна разгледзеў пытанні нацыянальнай палітыкі партыі ў нашай рэспубліцы. Амаль уся папярэдняя даследчая работа ў галіне мовазнаўства, літаратуры і гісторыі Беларусі дакастрычніцкага перыяду была аб'яўлена

«контррэвалюцыйнай», спынена і забаронена. Амаль усе навуковыя публікацыі і нават падручнікі канфіскаваны з бібліятэк і знішчаны. За захоўванне іх у асабістым карыстанні пагражаў арышт і суд. У вучэбных праграмах былі зроблены адпаведныя купюры.

У гэты час у сваім артыкуле «За ленінскую лінію ў нацпалітыцы» загадчык аддзела ЦК КП(б)Б А. Сянкевіч, характарызуючы праграму і дзейнасць контррэвалюцыйнай групы беларускіх нацыянал-дэмакратаў, пісаў: «Выкрытая органамі ДПУ контррэвалюцыйная група на чале з былымі міністрамі і дзеячамі Беларускай Рады — Ластоўскім, Цвікевічам, Лёсікам, Некрашэвічам і іншымі, акапаўшыміся ў Беларускай акадэміі навук, прасунула адтуль свае шчупальцы на шэраг участкаў эканамічнага і культурнага фронту: Наркамзем, Наркамасвету, Белдзяржвыдавецтва і інш. ...Захапіўшы ў свае рукі шэраг навукова-даследчых устаноў (БАН, ІНДІ) і шэраг кафедраў у вышэйшых навучальных установах, контррэвалюцыйныя нацыянал-дэмакраты імкнуліся падрыхтаваць сабе навуковую змену...».

Інстытуту філасофіі БАН было даручана «навукова» абгрунтаваць рэпрэсіі супраць нацыянальнай інтэлігенцыі, і ўжо ў 1931 годзе выйшла кніга, напісаная калектывам аўтараў гэтага інстытута пад інтрыгуючай назвай «Навука» на службе нацдэмаўскай контррэвалюцыі». У чым толькі не абвінавачваўся на старонках данай кнігі Сцяпан Міхайлавіч!

Што ж ставілі ў віну Некрашэвічу аўтары гэтай кнігі?

...У сваім дакладзе «Да пытання аб укладанні слоўніка жывой беларускай мовы», чытаным на секцыі мовы Інстытута беларускай культуры ў 1925 годзе, Некрашэвіч толькі цвярдзіў старыя лёсікаўскія зады. Галоўная ўстаноўка гэтага даклада заключаецца ў тым, што адзінаю, невычарпальнаю, чыстаю моўнаю крыніцаю з'яўляецца сярэдневяковая старына і яе жывы носьбіт — беларуская вёска. «Глухая, цёмная вёска, для якой незнаёма была кніжная асвета і якая не толькі не мела зносін з чужынцамі ў краі, але фактычна і мець не магла, бо ёй, мужыцкай, ганьбавалі,— толькі гэтая вёска на працягу шмат вякоў у чыстаце захоўвала свой найдарожшы скарб — беларускую мову»,— так цытуецца даклад С. М. Некрашэвіча.

Заклік Сцяпана Міхайлавіча вывучаць народную мову, беражліва адносіцца да яе інтэрпрэтаваўся зусім наадварот.

Аўтары названай кнігі дайшлі ад дакораў у вернасці скарынінскім традыцыям да палітычных абвінавачванняў

Некрашэвіча і Байкова. Падтасоўваючы факты, прыйшлі да наступнага вываду:

«Стоячы на варце «скарынінскай» чыстаты беларускай мовы, нацдэмы ажыццяўлялі яе,— так выражаўся Некрашэвіч,— «апрацоўку». У чым жа заключалася гэтая «апрацоўка»? Яна вялася па наступных напрамках:

1) увядзенне ў сучасную беларускую мову архаізмаў усялякага роду, у большасці запазычаных з рэлігійных помнікаў сярэдневякоўя і гістарычных дакументаў той жа эпохі;

2) утварэнне новых слоў на прынцыпах пурызму — захавання «самабытнай» чыстаты беларускай мовы і выгнання з яе элементаў інтэрнацыяналізму;

3) ахова беларускай мовы ад пранікнення ў яе савецізмаў і процідзеянне ўплыву на яе развіццё пралетарыяту;

4) барацьба з рускімі элементамі ў беларускай мове і максімальная паланізацыя яе».

І вось, нарэшце, перад калегіяй АДПУ БССР 10 красавіка 1931 года паўсталі член прэзідыума Беларускай акадэміі навук С. М. Некрашэвіч, акадэмік БАН В. У. Ластоўскі, інспектар Наркамфіна БССР Л. І. Заяц, член літаратурнага аб'яднання «Узвышша» А. Я. Адамовіч, выкладчык Я. Я. Кіпель, стыльрэдактар газеты «Звязда» П. Я. Жаўрыд і іншыя.

Усе яны былі прызнаны віноўнымі ў тым, што, з'яўляючыся членамі контррэвалюцыйнай нацыяналістычнай арганізацыі «Саюза адраджэння Беларусі» («САБ»), пазней перайменаванай у Саюз вызвалення Беларусі («СВБ»), адзяйснялі арганізацыйнае шкодніцтва на культурным, ідэалагічным і іншых участках сацыялістычнага будаўніцтва, *праводзілі антысавецкую* нацыяналістычную агітацыю, накіраваную на замаруджванне тэмпаў развіцця Беларусі па сацыялістычнаму шляху, ставячы канчатковай мэтай адарванне Беларусі ў этнаграфічных межах ад Савецкага Саюза і стварэнне так званай Беларускай народнай рэспублікі.

Акрамя таго, В. У. Ластоўскі, І. І. Краскоўскі, А. К. Галавінскі, Л. І. Заяц таксама абвінавачваліся ў тым, што яны былі ўдзельнікамі контррэвалюцыйнай арганізацыі «Беларускае брацтва».

Пастановай калегіі АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 года ўсе абвінавачваемыя, акрамя П. Я. Жаўрыда, былі высланы тэрмінам на 5 гадоў кожны ў розныя гарады СССР. А Жаўрыд быў заключаны ў канцлагер тэрмінам на 5 гадоў.

*У артыкуле кандыдата гістарычных навук М. С. Сташкевіча* «Не адступаючы ад урокаў праўды» ёсць такія радкі: «Справа аб беларускіх «нацдэмах» раскручвалася хутка. *Яе кантралявалі Молатаў, Кагановіч, Ягода, а непасрэднай распрацоўкай займаліся адказныя асобы ў рэспубліцы — Гей, Рапапорт, Берман, Калнін, Рыскін, Ляўкоў* і іншыя. І хоць у іх дзеяннях не было выяўлена саставу злачынства, усе, хто праходзіў па гэтай «справе», былі высланы за межы Беларусі. Тады мала хто разумеў, з якой мэтай была здзейснена гэта акцыя...» (Советская Белоруссия. 1988. 27 *сак.).*

С. М. Некрашэвіч быў высланы ў г. Сарапул Удмурцкай АССР, дзе ён працаваў спачатку планавікомэканамістам кааператыўна-прамысловай арцелі інвалідаў, а затым бухгалтарам канторы «Заготзерно».

Сцяпан Міхайлавіч ужо збіраўся вярнуцца са ссылкі ў родную Беларусь, але яму не выдавалі ніякіх дакументаў. Некрашэвіч адчуваў нешта нядобрае. І ён не памыліўся. Пастановай Асобай Нарады пры НКУС СССР ад 14 ліпеня 1936 года Сцяпану Некрашэвічу і А. І. Цвікевічу тэрмін высылкі быў павялічаны на 2 гады кожнаму.

Сцяпана Міхайлавіча не стала 20 снежня 1937 года.

Беларускія савецкія гісторыкі спрабуюць асэнсаваць прычыны жорсткай расправы з прадстаўнікамі старой беларускай інтэлігенцыі. На думку М. С. Сташкевіча, менавіта ў абставінах эскалацыі сталінізму першымі павінны былі пайсці старыя спецыялісты, у мінулым не адразу прыняўшыя ідэі сацыялістычнай рэвалюцыі. Да іх адносіліся Ластоўскі, Некрашэвіч, Лёсік, Цвікевіч і іншыя былыя радаўскія дзеячы. І хоць яны парвалі са сваім мінулым, ім па-ранейшаму не давяралі. У 1937 годзе пачаўся новы ланцуг палітычных працэсаў. І ў гэтых абставінах вельмі хутка наступіла трагічная развязка: былыя радаўскія дзеячы, якія фактычна знаходзіліся ў ссылцы, зноў былі арыштаваны. Недавер і падазронасць і на гэты раз праявіліся ў адносінах да іх, у выніку чаго яны былі рэпрэсіраваны, многія памерлі ў заключэнні.

На думку аўтара гэтых радкоў, можна спрачацца з М. С. Сташкевічам у дэталях, але ў асноўным ён мае рацыю.

10 чэрвеня 1988 года Судовая калегія па крымінальных справах Вярхоўнага суда БССР разгледзела на закрытым пасяджэнні пратэст пракурора Беларускай ССР на пастанову калегіі АДПУ БССР ад 10 красавіка 1931 года па

абвінавачванню С. М. Некрашэвіча і інш., кіруючыся арт. 387 УПК БССР, вызначыла:

«Пастанову калегіі АДПУ ад 10 сакавіка 1931 года ў ад- носінах Некрашэвіча С. М., Ластоўскага В. У., Лёсі- ка Я. Ю., Краскоўскага І. І., Цвікевіча А. І., Смоліча А. А., Трэмповіча П. В., Чаржынскага У. В., Серады І. М., Пда- кулевіча У. М., Галавінскага А. К., Валькевіча А. І., Заяц Л. І., Жаўрыда П. Я., Адамовіча А. Я., Кіпеля Я. Я. і Пастанову Асобай Парады пры НКУС СССР ад 14 лі- пеня 1936 года ў адносінах Некрашэвіча С. М. і Цвікевіча А. І,— адмяніць і справу спыніць за адсутнасцю ў іх дзеян- нях саставу злачынства.

*Старшынствуючы.............................. В. П. Пташнік*
*Члены суда: .........................................П. А. Ашуйка*
*Н. І. Герменчук».*

Рэабілітацыя С. М. Некрашэвіча адбылася даволі поз- на, але добра, што яна адбылася. Перад намі прайшлі ас- ноўныя вехі жыццёвага і творчага шляху чалавека скла- данага і цяжкага лёсу. Таленавіты беларускі вучоны, пер- шы старшыня Інстытута беларускай культуры, член ЦВК БССР, Сцяпан Некрашэвіч вяртаецца да нас як чалавек, які свой творчы талент прысвяціў развіццю нацыяналь- най культуры.